Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-09-20

# На тым тыдні...

✓ **6 верасня** ў Музеі гісторыі горада Мінска адбыўся **круглы стол «Гісторыка-культурныя каштоўнасці як аб'екты культурнага турызму»**, прымеркаваны да Еўрапейскіх Дзён Спадчыны ў Беларусі, мэта якіх – абудзіць цікавасць да помнікаў прыроды і культуры, звярнуць увагу на праблему захавання, на неабходнасць міжкультурнага дыялогу ў справе аховы аб'ектаў спадчыны і іх выкарыстання ў адукацыйных і турыстычных мэтах; спрыяць сцвярджэнню як разнастайнасці, так і агульнасці культур еўрапейскага кантынента, фармаванню нацыянальнай і еўрапейскай ідэнтычнасці.

У гэты ж дзень пачала працаваць **фотавыстаўка «Спадчына і турызм»** (яна працягнецца да 21 верасня). Тут адлюстраванае багацце прыроднай і культурнай спадчыны Беларусі, а таксама яе патэнцыял як аб'екта культурнага турызму. Арганізатарамі выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Інстытут культуры Беларусі і Музей гісторыі горада Мінска, а таксама Грамадскае аб'яднанне «Творчы саюз "Фотамастацтва"».

✓ **13 верасня** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася **прэзентацыя Збору твораў Максіма Танка ў 13 тамах**, падрыхтаванага Інстытутам мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, што выйшаў у выдавецтве «Беларуская навука». У тамах прадстаўленыя вершы і паэмы пісьменніка, апавяданні, нарысы, фельетоны, нататкі і інш. творы класіка. Упершыню апублікаваныя лісты М. Танка (за выключэннем лістоў, раней прадстаўленых у перыядычным друку), дзённікі (першапублікацыя якіх адбылася ў часопісе «Полымя»), пераклады, артыкулы і выступленні (раней апублікаваныя ў перыядычных выданнях Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы).

✓ **15 верасня** ў г. Мядзел адбылося **Рэспубліканскае свята паэзіі і песні «Я сэрцам пісаў сваю кожную песню...»**, прысвечанае 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Максіма Танка. Сярод святочных мерапрыемстваў былі ўскладанне кветак да магілы паэта (в. Новікі Мядзельскага раёна), цырымонія адкрыцця камня ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння класіка ў г. Мядзел, адкрыццё выставкі па выніках фотапленэра «Дарогамі Максіма Танка», выстаўка кветкавых кампазіцый паводле твораў паэта, прэзентацыя кнігі «Усё жыццё я не любіў растанняў... ». У свяце прымалі ўдзел пісьменнікі і даследчыкі: В. Шніп, А. Бадак, Т. Сівец, А. Бутэвіч, Дз. Пятровіч, В. Рагойша, М. Чаргінец, Г. Пашкоў, М. Мятліцкі, М. Шабовіч, М. Мікуліч і інш. Арганізавалі свята Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Мінскі абласны выканаўчы камітэт, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры.